**ГУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за студзень 2020 г.

У студзені ў публічных бібліятэках ДУК быў праведзены раённы месячнік вернутай кнігі. У рамках месячніка ў бібліятэках прайшлі дні, тыдні дараванага запазычальніка, гадзіны творчасці «Сакрэты кніжнага даўгалецця», акцыі «Чытач дарыць чытачу», бібліятэчныя ўрокі «Кніга пачынаецца з вокладкі», электронныя прэзентацыі «Вылечыць кнігу можа кожны», майстар-класы па вырабе кніжных закладак, латарэі па розыгрышы 10 першых нумароў чытацкіх квіткоў.

## <u>Мерапрыемствы ў рамках акцыі «Карысныя канікулы»</u>

**3 студзеня**

Удзельнікі клуба «Бригантина» запрасілі сваіх сяброў на вясёлую навагоднюю тусоўку «Новогодние чудеса в библиотеке». Падчас забаўляльнай праграмы «Зима – пора чудес» дзеці прынялі актыўны ўдзел у шматлікіх конкурсах, адкрылі і разгадалі «Сундук с загадками», пайгралі каля ёлкі «Всё про Новый год» і пачулі прадказанне «Узнай, что год грядущий нам готовит». На свята прыйшлі Дзед Мароз і Снягурка з казачным персанажам Кікімарай. Разам з імі дзеці падарожнічалі па навагодніх казках, адказвалі на пытанні віктарыны «Как встречают Новый год люди всех земных широт», разгадвалі навагоднія загадкі.

Гарадзецкі філіял, 28 чал.

**3 студзеня**

У час правядзення гадзіны мастацтва «Тэатр “Сказка” запрашае» дзеці прагледзелі лялечны спектакль «Новогодние приключения сказочных героев” і прынялі ўдзел у літаратурна-гульнёвай праграме «На журнальной орбите». Прадстаўлена кніжная выстава «Что принёс нам почтальон».

Дзіцячы філіял, 44 чал.

**10 студзеня**

У бібліятэцы прайшла гадзіна фальклору «Край свой родны абыйду, скарбы розныя знайду». Дзякуючы выставе «Пра тую зямлю, дзе ты нарадзіўся» і расказу бібліятэкара дзеці даведаліся аб гісторыі раёна, яго жыцці ў ваенныя гады, пра сімволіку, вядомых людзей – нашых землякоў. Адказваючы на пытанні віктарыны «Я ведаю і люблю сваю малую радзіму», дзеці паказалі, што добра засвоілі атрыманыя веды. Цікавасць у школьнікаў выклікала экскурсія ў Дом рамёстваў. Завяршэннем мерапрыемства стала лялечнае прадстаўленне.

Дзівінскі філіял, 37 чал.

## Мерапрыемствы да Навагодніх свят і Раства

**11 студзеня**

Круглы стол для сельскіх бібліятэкараў «В ракурсе итогов, планов, перспектив» прайшоў у незвычайным фармаце. Падвядзенне вынікаў раённага конкурсу «Создать новый образ» завяршылася ўзнагароджаннем пераможцаў. Вызначаны і лепшыя бібліятэкі 2019 года – Гарадзецкі філіял і Залеская публічная бібліятэка. Падарункамі бібліятэкарам сталі спектакль «Кобрин – маленький Тель-Авив», пастаўлены аматарскім тэатрам-студыяй «Пирожок», і песні ад вакальнага гурта «Фантазия».

ЦРБ, 54 чал.

**11 студзеня**

Госці каляднага вечара адпачынку ў аматарскім клубе «Залатыя гады» «Соберём друзей у ёлки» даведаліся шмат цікавага з гісторыі Раства Хрыстова і Новага года, пазнаёміліся з традыцыямі навагодніх святаў. Вакальная група «Фантазія» павіншавала гасцей выдатнай канцэртнай праграмай. Смачны калядны пачастунак стаў прыемным завяршэннем сустрэчы.

ЦРБ, 53 чал.

**12 студзеня**

Калядная ёлка «Пасланнем выратавання ззяе зорка» сабрала людзей match рознага ўзросту. Прысутныя прагледзелі спектакль «Калядная гісторыя», падрыхтаваны бібліятэкарамі і навучэнцамі нядзельнай школы храма Узнясення Гасподняга аг. Гарадзец. Госці, дзіцячы хор нядзельнай школы і народны ансамбль сельскага клуба спявалі традыцыйныя калядныя песні. Юнымі карыстальнікамі бібліятэкі прадэманстравана паэтычная кампазіцыя «Званочкі звіняць – пра Раство кажуць». Айцец Георгій павіншаваў усіх са святам, а юным артыстам уручыў калядныя падарункі.

Гарадзецкі філіял, 150 чал.

**16 студзеня**

Дзіцячы клуб «Крынічка» сумесна з Залескай нядзельнай школай і цэнтрам культуры і вольнага часу прадставілі спектакль па кнізе Ю. Насветавай «Кукла рождественской девочки». У гасцях таксама былі выхаванцы нядзельнай школы Пятрапаўлаўскай царквы, якія прыехалі з тэатрам лялек «Батлейка» і паказалі біблейскую гісторыю пра народзіны Хрыста. Айцец Сергій павіншаваў усіх са святам, а юным артыстам уручыў калядныя падарункі.

Залеская, 150 чал.

**19 студзеня**

Члены літаратурнага клуба «ПоэтиКо» выступілі перад гледачамі з вусным часопісам «Святочнае асарці», прысвечаным тром святам – Новаму году, Раству Хрыстову і Хрышчэнню Гасподняму. Дадаткам да паэтычнай праграмы сталі вакальныя нумары ад бібліятэкара Наталлі Раманюк і гасцей Мікалая Назарука і Вадзіма Падаспея.

ЦРБ, 45 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**23 студзеня**

У час правядзення літаратурнага свята «Живое слово прозы и поэзии» адбылася творчая сустрэча з членам Міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў Надзеяй Момлік. Прысутныя пазнаёміліся з новай кнігай паэтэсы «Какого цвета грусть», гучалі яе вершы і з іншых кніг і зборнікаў. Гасцямі мерапрыемства былі паэты, барды, кампазітары, якія чыталі вершы і выконвалі песні на словы Надзеі Момлік. Да мерапрыемства падрыхтаваны відэапрэзентацыя «Что судьбой уготовано» і кніжная выстава «Мелодией звучит строка».

Дзівінскі філіял, 86 чал.

**27 студзеня**

Гадзіна краязнаўства «Старонкі гісторыі маёй малой радзімы» прайшла для навучэнцаў Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа і была прымеркавана да 80-годдзя Кобрынскага раёна. Супрацоўнікі бібліятэкі расказалі прысутным гісторыю раёна з часу заснавання і да нашых дзён, пра жыццё Кобрыншчыны ў ваенныя гады. Госці даведаліся, што кобрынская зямля падарыла свету нямала выдатных навукоўцаў, акадэмікаў, даследчыкаў, якія сваімі адкрыццямі прынеслі вядомасць не толькі сабе, але і ўславілі сваю малую радзіму.

ЦРБ, 78 чал.

## Выдавецкая дзейнасць

**13 студзеня**

Па выніках літаратурнага конкурсу «Радуга созвучий», праведзенага Кобрынскай цэнтральнай бібліятэкай да свайго 80-годдзя, аддзелам бібліятэчнага маркетынгу выдадзены зборнік вершаў «Свидание с Мудростью». У зборніку 3 раздзелы: «Если книги - судьба» (вершы аб бібліятэкарах), «Книжный храм» (вершы пра бібліятэку), «Её величество Книга» (вершы пра кнігі).

**15 студзеня**

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу да 80-годдзя Кобрынскага раёна выдадзены паэтычны зборнік «Глыток родных крыніц». У кнігу ўвайшлі вершы сямі членаў літаратурнага клуба «ПоэтиКо», які працуе пры Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы. Усе творы прысвечаны малой радзіме – Кобрыншчыне і родным краявідам.

**20 студзеня**

Бібліёграфамі цэнтральнай раённай бібліятэкі выдадзены бягучы бібліяграфічны паказальнік «Новая літаратура аб Кобрыне і Кобрынскім раёне за 2019 год».

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81